**УДК 340.15**

# ПРЫЧЫНЫ І ПЕРАДУМОВЫ РЭФОРМАЎ У РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVIII СТАГОДДЗЯ

***А.В. ВАЛЕЎКА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт);***
***д-р юрыд. навук, праф. Т.І. ДОЎНАР***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)***

*Аналізуюцца прававыя, палітычныя і ідэалагічныя перадумовы рэфармавання дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII стагоддзя. Зроблена выснова, што напрыканцы першай паловы XVIII стагоддзя склаліся пэўныя перадумовы для разгляду на сойме пытанняў рэфармавання дзяржавы. Вылучаны асноўныя фактары, якія спрыялі фарміраванню і ажыццяўленню рэфарматарскай праграмы, распрацаванай прыхільнікамі кардынальных змен у дзяржаўным ладзе Рэчы Паспалітай.*

***Ключавыя словы:*** *Рэч Паспалітая, дзяржаўны лад, рэфармаванне, рэфарматарская праграма.*

Працэс гістарычнага развіцця беларускай дзяржаўнасці і прававой сістэмы быў вельмі насычаным і своеасаблівым. Тым больш што ў пэўныя перыяды на працягу шматвекавой гісторыі беларускія землі ўваходзілі ў склад іншых дзяржаў, якія мелі ўласны дзяржаўны лад і прававую сістэму.

Першая палова XVIII стагоддзя ў гісторыі Рэчы Паспалітай адзначана паглыбленнем крызісу дзяржавы. Своеасаблівы дзяржаўны лад у сукупнасці з пануючай сярод кіруючай эліты ідэалогіі, а таксама шэрагам знешнепалітычных фактараў завёў грамадства і дзяржаўныя ўстановы ў тупіковую сітуацыю. Больш за ўсё шматлікія войны на тэрыторыі дзяржавы, сярод якіх асабліва цяжкія наступствы мела Паўночная вайна, знішчалі гаспадарку і не давалі нават магчымасці яе аднавіць і развіваць далей. Акрамя таго, барацьба паміж буйнымі магнацкімі родамі за дамінаванне ў Рэчы Паспалітай набыла небывалы размах. Увогуле магнацкія групоўкі, якія часцей не лічыліся з дзяржаўнымі інтарэсамі, развязваючы паміж сабой сапраўдныя войны, імкнуліся ажыццяўляць уласныя палітычныя праграмы. «Узброены Радзівілаў натоўп у прыступе шаленства ці на загад князя не раз нападаў на шляхецкія дамы, на абывацельскіх сойміках у Вільні, Менску і Лідзе не раз даходзіла да крывавых сцэнаў...», – пісаў пра тыя часы Юзаф Грайнэрт [1, с. 323].

Такое бязладдзе паралізавала дзяржаву, а абыякавасць правячай дынастыі Вецінаў яшчэ больш дэмаралізавала шляхту. Абдораная ўсемагчымымі прывілеямі, пануючы над усім грамадствам, сама шляхта як стан перажывала апатыю і выраджалася [1, с. 323]. Акрамя таго, дадаваўся нанова абуджаны партыкулярызм, які паралізоўваў і без таго слабую Рэч Паспалітую. Вялізная шматнацыянальная дзяржава толькі знешне здавалася яшчэ адзінай. Разрозненых алігархаў не хвалявалі дзяржаўныя інтарэсы. Яны не думалі, як супольна ратавацца ад знешніх пагроз, а наадварот, імкнуліся выкарыстаць расійскія штыкі для звядзення рахункаў з супернікам і ўмацавання сваіх пазіцый [1, с. 324–325]. Фактычна Рэч Паспалітая ў першай палове XVIII стагоддзя перажывала перыяд феадальнай раздробленасці, у той час як у Заходняй Еўропе складаліся моцныя цэнтралізаваныя дзяржавы і распаўсюджваліся ідэі Асветы.

Значнай перашкодай для павышэння аўтарытэту і моцы дзяржаўнай улады была пануючая сярод шляхты ідэалогія сарматызму, палітычны ідэалам якой з’яўляўся дзяржаўны традыцыяналізм, кансерватызм (“нічога новага”), непрыманне абсалютызму [2, с. 151]. На думку большасці шляхты, манархам павінен быць ураджэнец Рэчы Паспалітай, якога ў першую чаргу цікавяць справы вайсковыя, а ўжо потым мастацтва і рэлігія, які апранаецца ў польскі строй, а не ў іншаземнае адзенне і які павінен дбаць аб зберагaнні шляхецкіх прывілеяў і вольнасцей [2, с. 151]. Тадэуш Корзан дае такую адзнаку тагачаснай шляхце: “гэта было цямнейшае з пакаленняў, што ведала гісторыя” [3, с. 32]. Такім чынам, кіруючая ў Рэчы Паспалітай сістэма вартасцей і поглядаў пануючага саслоў’я на дзяржаўную ўладу і права не спрыяла магчымасці пераадолення існуючых праблем шляхам рэфармавання існуючага парадку.

Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай, які шляхта лічыла ідэальным, не даваў магчымасці не толькі праводзіць рэформы, але, і часцей за ўсё, вырашаць бягучыя дзяржаўныя пытанні. Сойм – вышэйшы орган дзяржаўнай улады – не дзейнічаў, бо цалкам кантраляваўся гэтымі самымі магнацкімі родамі. Паказальна тое, што «з 55 соймаў, якія скліканіся ў 1652–1764 гадах, 42 былі сарваны накладаннем вета» [4]. Сітуацыя, калі кожны прадстаўнік шляхты мог блакіраваць любое рашэнне сойма, рабіла вельмі праблематычным вырашэнне многіх важных пытанняў. Акрамя таго, унясенне змен у палітычны лад магло расцэньвацца як парушэнне праваў шляхты і было падставай для непадпарадкавання дзяржаўнай уладзе.

Існуючы парадак поўнасцю зжыў сябе і зусім не адпавядаў тым рэаліям, якія ўзнікалі ў многіх еўрапейскіх краінах. Тагачасны дзяржаўны і грамадскі лад Рэчы Паспалітай С. Кутшэба характарызуе як «закасцянелы», «захоўваючы ў сабе рысы сярэдніх вякоў» [5, с. 177]. Для паспяховага пераадолення

крызісу і ажыццяўлення рэфармавання патрэбна была моцная аснова, «выпрацаванае ўжо ўсведамленне неабходнасці гэтых рэформ» [5, с. 178].

Польскі гісторык Тадэуш Корзан на падставе аналізу сітуацыі, якая існавала ў Рэчы Паспалітай, вылучыў тры магчымыя напрамкі развіцця дзяржаўнага ладу дзяржавы абоіх народаў – манархія; арыстакратычны ўрад, накшталт Венецыі; дэмакратыя [3, l. 32]. Кожны з вызначаных напрамкаў патрабаваў асаблівых умоў і дзеянняў з боку розных катэгорый насельніцтва. Пры гэтым патрэбна было ўлічваць, што гэта закранала інтарэсы суседніх імперый, у першую чаргу Прусіі і Расіі, у дачыненні Рэчы Паспалітай.

Паступова ва ўсё больш шырокіх колах грамадства пачалі выспяваць ідэі аб неабходнасці змянення існуючага парадку. У першую чаргу такія ідэі прапаноўваліся найбольш адукаванымі людзьмі. Так, у публікацыях такіх знакамітых мысліцелей і дзяржаўных дзеячаў, як Ляшчынскі, Карвіцкі, Канарскі, Сташыц, Калантай і іншыя пачалі выказвацца какрэтныя прапановы аб зменах у дзяржаўным ладзе Рэчы Паспалітай, ідалагічнай падставай якім з'яўляліся ідэі Асветніцтва [5, с. 178]. У гэты час асабліва бурна развіваецца палітычная і памфлетычная літаратура. У самым пачатку XVIII стагоддзя з'явіліся «Віленская пастанова» (1700), «Зацямненне Польшчы» падканцлера ВКЛ С. Шчукі (1709). Пераломным момантам у развіцці палітычнай думкі саксонскіх часоў сталі 40-я гады. Тады з'явіліся ў друку «Вольны голас, які волю абяцае» Станіслава Ляшчынскага, «Лісты зямяніна» ваяводы мазавецкага Станіслава Панятоўскага і «Анатомія Рэчы Паспалітай» С. Гарчынскага (1751) [2, с. 210]. Аб рэфарматарскіх памкненнях сведчаць дэбаты на сеймах і сейміках, асабліва тыя, што тычыліся рэформаў скарбу (фінансаў) і войска [2, с. 210]. Такім чынам, пачалося фарміраванне ідэалагічнай асновы для ажыццяўлення рэформ у Рэчы Паспалітай.

У сярэдзіне XVIII стагоддзя ў Рэчы Паспалітай склаліся таксама і эканамічныя перадумовы рэформ. Гаспадарка краіны была разбурана ваеннымі канфліктамі, таму ўзнікла неабходнасць яе аднавіць і далей развіваць. Аднаўленне панскай і сялянскай гаспадарак да сярэдзіны стагоддзя ў асноўным завяршылася і стала падставай для далейшага развіцця эканомікі. Гэтаму ў многім спрыялі змены ў арганізацыі гаспадарчага жыцця. Значнае скарачэнне колькасці насельніцтва, знішчэнне цяглавай і прадукцыйнай жывёлы, вывядзенне з гаспадарчага абарачэння вялікіх плошчаў ворыўных зямель прымусіла ўласнікаў шукаць новыя, больш эфектыўныя шляхі аднаўлення і развіцця гаспадаркі [2, с. 184]. Гаспадарчая сітэма, якая існавала на той момант у дзяржаве, ужо не была эфектыўнай. Асабліва гэта было бачна на прыкладзе каралеўскіх сталовых эканомій [2, с. 185]. Большая частка зямель каралеўскіх эканомій знаходзілася ў карыстанні буйнымі феадаламі на розных падставах. Адных феадалаў кароль узнагароджваў зямлёю за заслугі перад дзяржавай, другім даваў маёнткі на пэўны тэрмін у якасці платы за пазыку грошай, трэцім – у часовае трыманне на ўмовах выплаты грашовай рэнты ў скарб [2, с. 185]. Часовыя арандатары каралеўскіх зямель не заўсёды былі заінтарэсаваны ў перспектывах развіцця гаспадаркі і яе захаванні ў належным стане. Імкнучыся павялічыць свае прыбыткі, трымальнікі часта парушалі "ўставы" эканомій, прымушалі сялян плаціць большыя чыншы ці адпрацоўваць большую колькасць дзён на паншчыне, чынілі іншыя бяспраўі. Да таго ж у часовых трымальнікаў стала традыцыяй затрымлівацца з выплатай у скарб грошай, прызначаных з арандаваных уладанняў [2, с. 185]. Такім чынам, дзяржаўны скарб часта не атрымліваў належны даход з земляў. Такая сітуацыя стала адной з прычын пошуку новых падыходаў да парадку карыстання і кіравання дзяржаўнай маёмасцю. Адным з напрамкаў павышэння эфектыўнасці і цэнтралізацыі гаспадарчай і фінансавай дзейнасці ў Рэчы Паспалітай стала стварэнне ў 1764 годзе Скарбовай камісіі, якая займалася ўсімі фінансавымі справамі дзяржавы. Гэта быў першы крок да рэфармавання эканомікі Рэчы Паспалітай згодна з патрабаваннямі часу.

Наступным этапам у развіцці гаспадаркі Рэчы Паспалітай былі рэформы А. Тызенгаўза. Ён праследаваў таксама пэўныя палітычныя мэты. Асноўную прычыну слабасці Рэчы Паспалітай А. Тызенгауз, як і многія прыхільнікі рэфармавання дзяржаўнага ладу, бачыў у кволасці яе цэнтральнай улады. Таму надворны падскарбій лічыў сваімі галоўнымі задачамі ўмацаванне каралеўскай улады, пазбаўленне яе залежнасці ад грашовай і палітычнай падтрымкі магнатаў, арганізацыю апоры на сярэднюю і дробную шляхту. У шэрагу задач стаяла і фінансавая незалежнасць караля ад сойма [2, с. 185]. Гэтыя фактары маглі б забяспечыць узмацненне і цэнтралізацыю дзяржаўнай улады, што з'яўлялася неабходным для пераадолення катастрафічных наступстваў крызісу ў Рэчы Паспалітай.

У перыяд безкараўлеўя, які распачаўся ў 1763 годзе пасля смерці Аўгуста III, узмацнілася супрацьстаянне некалькіх арыстакратычных партый, кожная з каторых мела свой погляд на будучыню Рэчы Паспалітай. Прадстаўнікі партыі Чартарыйскіх, якая з сярэдзіны XVIII стагоддзя стала галоўнай апорай Расійскай імперыі ў Рэчы Паспалітай, выступалі за актыўныя рэформы, скасаванне «liberum veto», узмацненне каралеўскай улады. Ім супрацьстаялі шматлікія прадстаўнікі магнатэрыі: Браніцкія, Патоцкія, Сапегі, Радзівілы. «Фамілія», узначаленая вялікім канцлерам літоўскім Міхаілам (1652–1775), была ў меншасці, аднак сярод іх праціўнікаў не было адзінства, што, канешне, давала перавагу першым [6, с. 89]. Праграма рэформаў партыі Чартарыйскіх прадугледжвала абмежаванне ўлады манарха, ліквідаванне яго права раздаваць пасады. Рэфармаванне сойма павінна было прывесці да так званага «гатовага сейма», які на працягу двух гадоў заўсёды мог быць скліканы ў выпадку неабходнасці, скасавання права «liberum veto» [2, с. 210]. Партыя Чартарыйскіх выступала таксама за абмежаванне ўлады падскарбіяў і ліквідацыю гетманства. Яшчэ восенню 1763 года Чартарыйскія імкнуліся правесці рэформы шляхам дзяржаўнага перавароту,

пазбаўлення ўлады хворага Аўгуста Ш з дапамогай канфедэрацыі [2, с. 211]. Аднак ідэя развязвання ў Рэчы Паспалітай чарговай грамадзянскай вайны на той час не знайшла падтрымкі ў Пецярбургу.

Рэальная магчымасць ухвалення рэформаў узнікла падчас правядзення канвакацыйнага сойма 1764 года, бо партыя Чартарыйскіх атрымала знешнюю падтрымку ад Расіі. Віленская канфедэрацыя, узнікшая як адказ на дзеянні К. Радзівіла па ўмяшанню ў выбары паслоў на сойм, запрасіла на тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага шасцітысячны корпус генерала Рэненкампфа [6, с. 153]. Асноўнай мэтай расійскага войска з'яўлялася «абарона адданых патрыётаў і сяброў ад насілляў і ўціскаў супрацьлеглай партыі, у якой галоўныя кіраўнікі – гетман каронны граф Браніцкі, ваявода кіеўскі граф Патоцкі, а асабліва ў Літве ваявода Віленскі князь Радзівіл» [2, с. 220].

Пешапачаткова прадстаўнікі кансерватыўнай часткі шляхты мелі намер сарваць пасяджэнне сойма, аднак Чартарыйскія напомнілі, што на канвакацыйным сойме не дзейнічае прынцып «liberum veto», бо па сваім прававым характары канвакацыя раўнаважна канфедэрацыі [7, l. 75]. Лідэры апазіцыі гетман К. Браніцкі і К. Радзівіл на другі дзень са сваімі прыхільнікамі пакінулі сойм. Пасля гэтага ўзнікла спрыяльная сітуацыя для прыхільнікаў рэформ.

За час сваёй працы, з 7 мая па 23 чэрвеня, сейм ухваліў больш чым 180 пастаноў [2, с. 220]. Пры гэтым было вырашана праводзіць рэформы паступова, бо ні Прусія, ні Расія не былі зацікаўлены ў рэзкіх зменах, якія б спрыялі ўзмацненню Рэчы Паспалітай.

Такім чынам, можна зрабіць *выснову*, што напрыканцы першай паловы XVIII стагоддзя склаліся пэўныя перадумовы для разгляду на сойме пытанняў рэфармавання дзяржавы. І потым практычнага ажыццяўлення рэформаў, так неабходных для Рэчы Паспалітай. У першую чаргу, быў распрацаваны ідэалагічны падмурак для рэфармавання, бо змены ў дзяржаўным ладзе магчымы былі толькі тады, калі б змяніліся погляды як шляхты, так і алігархіі на адносіны паміж дзяржавай і грамадствам. Менавіта гэтаму садзейнічала распаўсюджванне ідэй Асветніцтва сярод пануючага саслоў'я, што дало моцны штуршок да ўсведамлення неабходнасці ажыццяўлення рэформ і выйсця з той цяжкай сітуацыі, у якой Рэч Паспалітая знаходзілася на пачатку XVIII стагоддзя. Пры гэтым трэба адзначыць, што прыхільнікі рэформ атрымалі перавагу дзякуючы знешняй падрымцы, бо зрабіць гэта ўласнымі сіламі ў той час было вельмі праблематычна. Аднак гэты фактар пазней меў негатыўныя наступствы, бо пазначылася тэндэнцыя ўсе большага расійскага ўплыву на ўнутрыпалітычныя справы Рэчы Паспалітай.

ЛІТАРАТУРА


1. Сагановіч, Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. / Г. Сагановіч. – Минск : Энцыклапедыкс, 2001. – 412 с.
2. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / Ю. Бохан [і інш.] ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2007. – Т. 3 : Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.). – 344 с.
3. Korzon, T. Wewnetrzne dzieje Polski za Stanislawa Augusta (1764–1794) badania historyczne zestanowiska ekonomicznego i administracyjnego / T. Korzon. T. 1. – Kraków : Księgarnia L. Zwolińskiego i S-ki ; Warszawa : nakł. Księgarni Teodora Paprockiego i S-ki, 1897. – 513 l.
4. Галечанка, Г. Развіццё шляхецкай дэмакратыі ў Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVIII ст. / Г. Галечанка ; пер. з рус. А. Шаланда // Герольд Litherland. – 2001. – № 3. – С. 85–102
5. Кутшеба, С. Очерк истории общественно-государственного строя Польши / С. Кутшеба ; пер. с пол. и вступ. ст. Н.В. Ястребов. – СПб. : Изд-во А.С. Суворина, 1907. – 231 с.
6. Носов, Б.В. Установление российского господства в Речи Посполитой. 1756–1768 гг. / Б.В. Носов ; отв. ред. В.К. Волков. – М. : Индрик, 2004. – 728 с.
7. Aleksander Czaja Lata wielkich nadziei: walka o reformę państwa polskiego w drugie jpołowie XVIII w. / A. Czaja. – KsiążkaiWiedza, 1992. – 282 l.


*Паступіў 12.10.2017*

**REASONS AND PREREQUISITES OF REFORMS IN THE RZECZPOSPOLITA SECOND HALF OF XVIII CENTURY**

***A. VALIAUKA, T. DOUNAR***

*Article analyzes the legal, political and ideological premises of reforming the political system of the Commonwealth in the second half of the XVIII century. The basic factors that contributed to the formation and implementation of the reform program developed by the supporters of the radical changes in the political system of the Commonwealth.*

***Keywords:*** *Rzecz Pospolita, the state system, reformation, reformist program.*